УДК 94 (476) «1921/1939»

# АБ'ЯДНАННЕ КАТАЛІЦКАЙ АКАДЭМІЧНАЙ МОЛАДЗІ "АДРАДЖЭННЕ" Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

**Крывуць Віталій Іванавіч,**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Баранавічы, Беларусь)

*Даклад прысвечаны дзейнасці клерыкальнай студэнцкай арганізацыі – Аб'яднання каталіцкай акадэмічнай моладзі "Адраджэнне" – на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта ў 1921–1939 гг. Характарызуюцца ідэалогія і асноўныя накірункі яе працы ў студэнцкім асяроддзі. Таксама паказана ідэйна-палітычная эвалюцыя віленскага аддзялення арганізацыі.*

Віленскі ўніверсітэт імя С. Баторыя (УСБ) з'яўляўся адзінай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У міжваенны перыяд ён стаў арэнай дзейнасці шэрагу арганізацый, якія вялі барацьбу за ўплыў на мясцовае студэнцтва. пэўную ролю сярод іх адыгрывалі і клерыкальныя арганізацыі, у той ці іншай ступені звязаныя з рымска-каталіцкай царквой. Гэтаму садзейнічаў канфесійны склад віленскіх студэнтаў. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, у 1938/1939 навучальным годзе сярод студэнтаў і вольных слухачоў УСБ было: 2 205 каталікоў, 438 іўдзеяў, 409 праваслаўных, 50 пратэстантаў, 17 уніятаў, 15 мусульман, 7 старавераў і 7 караімаў [1, с. 237].

Найбольш уплывовай і прыкметнай клерыкальная арганізацыяй УСБ з'яўлялася Аб'яднанне каталіцкай акадэмічнай моладзі "Адраджэнне" (АКАМ). Віленскае аддзяленне арганізацыі ўзнікла ў 1921 г. Як і іншыя каталіцкія маладзёжныя саюзы АКАМ "Адраджэнне" было часткай т.зв. Каталіцкай акцыі. Адначасова арганізацыя падтрымлівала сувязь з "Пакс Рамана" – міжнародным сакратарыятам нацыянальных федэрацый студэнтаў-каталікоў [2, с. 90].

Згодна з першай ідэйнай дэкларацыяй (1923 г.), задачай арганізацыі было "абаперці жыццё ў Польшчы на законе Божым". Адначасова дэкларавалася павага да каталіцкай царквы. Афіцыйным лозунгам арганізацыі было "Аддаць нацыю Хрысту". Члены АКАМ "Адраджэнне" аб'яўлялі сябе грамадскімі каталікамі, якія стаяць на глебе натуральных і неабходных патрэб і законаў грамадскага жыцця. Асновамі гэтага жыцця называліся сям'я, правы ўласнасці і праца. Дэкларацыя прызнавала неабходнасць "вострай барацьбы з капіталістычнай эксплуатацыяй", але толькі шляхам рэформ. Таксама ў першай дэкларацыі прысутнічалі пэўныя моманты нацыяналістычнай і нават антысеміцкай ідэалогіі [3, с. 399–400].

Другая ідэйная дэкларацыя аб'яднання (1929 г.) сцвярджала, што Польшча павінна быць каталіцкай дзяржавай, а каталіцкая рэлігія – дзяржаўнай рэлігіяй. Адмаўляўся лаіцызм у калектыўным жыцці, сям'і і выхаваўчых арганізацыях. Згодна з дэкларацыяй, польская дзяржава павінна была забяспечыць народам,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якія пражываюць на яе тэрыторыі, свабоду развіцця. Але яна мае права ўзамен патрабаваць ад іх лаяльнасці. Важнай гістарычнай Польшчы аб'яўлялася абарона хрысціянства ад "антырэлігійнага ўплыву бальшавізму" [3, с. 405–406].

Дзейнасць АКАМ "Адраджэнне" падзялялася на ўнутраную і знешнюю. Унутранае жыццё адбывалася ў чатырох секцыях: кандыдацкай, філасофска-рэлігійнай, грамадскай і нацыянальнай. Кожны новы член арганізацыі павінен быў прайсці праз кандыдацкую секцыю, дзе ён знаёміўся з ідэалогіяй арганізацыі. Філасофска-рэлігійная секцыя займалася распрацоўкай тэалагічных пытанняў і праблем рэлігійнага жыцця, абапіраючыся ў сваёй працы на ідэі св. Фамы Аквінскага. Галоўнай задачай грамадскай секцыі лічылася знаёмства з каталіцкай сацыяльнай дактрынай. У грамадскай секцыі вялікая ўвага надавалася і літургічнаму рэлігійнаму жыццю студэнтаў. У нацыянальнай секцыі "крысталізаваўся спосаб мыслення ў нацыянальнай сферы" [4, с. 127–129].

Знешняя дзейнасць аб'яднання канцэнтравалася ў двух накірунках: набыццё ўменняў паспяховых і адпаведных дзеянняў у адменным ад «Адраджэння» асяроддзі і ўвядзенне хрысціянскага акцэнту ў ідэйна нейтральныя ці нават варожыя каталіцызму колы. Такім чынам члены арганізацыі набывалі сацыяльны вопыт, які выкарыстоўваўся спачатку ў студэнцкім жыцці, а ў перспектыве – ў афіцыйным грамадска-палітычным жыцці [4, с. 129].

Неабходна адзначыць, што на мяжы 1920–30-х гг. назіраўся працэс радыкалізацыі віленская студэнцтва. У пэўнай ступені ён закрануў і мясцовую арганізацыю АКАМ "Адраджэнне", старшынёй якой у той час з'яўляўся Г. Дэмбінські. Пад яго кіраўніцтвам студэнты-каталікі распачалі барацьбу з уплывам польскіх нацыяналістаў ва ўніверсітэце. Адначасова адбылося збліжэнне з радыкальнымі студэнцкімі саюзамі. Гэта з'яўлялася спецыфікай УСБ, паколькі ў іншых універсітэтах студэнты-клерыкалы даволі варожа ставіліся да свецкіх і радыкальных арганізацый [5, с. 30]. Значным поспехам віленскіх радыкалаў, аб'яднаных вакол Г. Дэмбінскага стала перамога ў 1931 г. на выбарах у "Брацкую дапамогу" УСБ – арганізацыю студэнцкага самакіравання і самадапамогі.

У 1932 г. "група Дэмбіньскага" стварыла праграму, якая выходзіла далёка за межы ўніверсітэцкага жыцця і клерыкальнай ідэалогіі. Прапанавалася ўвядзенне планавай эканомікі, падзел прыбыткаў паміж працоўнымі, агульнадзяржаўныя грамадскія работы, кааперацыя ў сельскай гаспадарцы, планавая індустрыялізацыя. Неабходнай перадумовай гэтай змены грамадскага ладу павінна была стаць "маральная рэвалюцыя" [6, с. 27–28]. Г. Дэмбінські заяўляў пра неабходнасць пераходу грамадскага каталіцызму на бок працоўных і падкрэсліваў неабходнасць вывучэння марксізму-ленінізму [6, с. 36].

У кансерватыўных колах Дэмбіньскага і яго прыхільнікаў сталі называць каталікамі-камуністамі. Летам 1932 г. агульнапольскае кіраўніцтва АКАМ "Адраджэнне" асудзіла пазіцыю віленскіх радыкалаў, якія ў адказ дэманстратыўна выйшлі з аб'яднання. У далейшым "група Дэмбіньскага" стала асновай арганізацыі Саюз студэнцкая лявіцы "Фронт", якая цесна супрацоўнічала з камуністычнай партыяй і камсамолам Заходняй Беларусі.

Не гледзячы на раскол і радыкалізацыю часткі сваіх членаў, АКАМ "Адраджэнне" ў Вільні не спыніла сваёй дзейнасці. Арганізацыя вярнулася на пазіцыі каталіцкай сацыяльнай дактрыны, нейтралітэта ў адносінах да польскіх нацыя-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

налістаў і супрацоўніцтва з уладамі і царкоўнай іерархіяй. Пры гэтым актыўнасць студэнтаў-клерыкалаў значна знізілася. Самай прыкметнай яе праявай было выданне ў 1933–1938 гг. часопіса “Пакс”. Яго пастулаты не выходзілі за межы, акрэсленыя папскімі сацыяльнымі энцыклікамі [7, с. 117].

Такім чынам, АКАМ “Адраджэнне” на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта вяло пэўную працу, накіраваную на прыцягненне студэнцтва на бок каталіцкай сацыяльнай дактрыны. Аднак радыкалізацыі віленскага студэнцтва прывяла да студэнтаў-клерыкалаў да арганізацыйнага і ідэйнага расколу.

## Літаратура

1. Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1938–1939. – Wilno: Druk Józefa Zawadzkiego, 1939. – 248 s.

2. Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce 1918–1970 / Cz. Kozlowski [i in.]; pod red. Cz. Kozlowskiego. – Warszawa: Iskry, 1971. – 192 s.

3. Turowski, K. „Odrodzenie”. Historja Stowarzyszenia Katolickiej Młodzieży Akademickiej / K. Turowski. – Warszawa: Ośrodek Dokumentacji i Studiów Społecznych, 1987. – 430 s.

4. Luter, A. Stowarzyszenie Katolickiej Młodzieży Akademickiej „Odrodzenie” w Wilnie jako prekursor ekumenizmu i dialogu katolicko-żydowskiego w Polsce / A. Luter // Forum teologiczne. – 2006. – T. VII. – S. 125–138.

5. Pilch, A. Studencki ruch polityczny w Polsce 1932 – 1939 / A. Pilch. – Warszawa: PWN, 1972. – 179 s.

6. Filipajtis, E. Lewica Akademicka w Wilnie / E. Filipajtis. – Białystok: Towarzystwo Naukowe, 1965. – 72 s.

7. Pilch, A. Prasa studencka w Polsce 1918 – 1939 / A. Pilch. – Kraków: PWN, 1990. – 170 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова